# Нашы юбіляры

## МІХАІЛ ЯУГЕНАВІЧ ЦІКОЦКІ
### (Да 60-годдзя з дня нараджэння)



Споўнілася 60 гадоў вядомаму вучонаму і журналісту, доктару філалагічных навук, прафесару Міхаілу Яўгенавічу Цікоцкаму.

М. Я. Цікоцкі нарадзіўся 20 лютага 1922 года ў Бабруйску ў сям'і кампазітара. У 1933 годзе сям'я пераехала ў Мінск. Тут ён закончыў сярэднюю школу. З пачаткам вайны Міхаіл Яўгенавіч апынуўся на акупіраванай тэрыторыі, а затым разам з маці і сястрой быў перапраўлены партызанамі ў Маскву. З восені 1943 года знаходзіўся ў радах Савецкай Арміі.

Пасля дэмабілізацыі М. Я. Цікоцкі паступіў вучыцца на факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна, які закончыў у 1950 годзе. Нейкі час працаваў у рэдакцыях часопіса «Вожык», газет «Савецкі селянін» і «Калгасная праўда». У 1950 годзе паступіў у аспірантуру, а праз тры гады абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Публіцыстыка Якуба Коласа».

З гэтага часу М. Я. Цікоцкі працуе на факультэце журналістыкі спачатку ў якасці выкладчыка, дацэнта кафедры тэорыі і практыкі савецкага друку, а пазней (з 1965 года) яе загадчыкам. Пасля стварэння кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання (кастрычнік 1969 года) становіцца загадчыкам гэтай кафедры, на якой паспяхова працуе і зараз. У 1972 годзе ён абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Праблемы публіцыстычнага стылю», а праз год быў зацверджаны ў навуковым званні прафесара.

М. Я. Цікоцкі чытае курсы лекцый па стылістыцы беларускай мовы і стылістыцы газетных жанраў, вядзе спецсемінар па эстэтыцы слова. У розныя часы ён вёў спецкурсы «Гісторыя беларускай журналістыкі XIX ст.», «Публіцыстыка Якуба Коласа», распрацаваны спецкурс «Праблемы мастацкага і публіцыстычнага стылю». Яго лекцыі вызначаюцца ідэйна-тэарэтычнай і навуковай глыбінёй, даступнасцю ўспрымання, творчай пранікнёнасцю і слухаюцца студэнтамі з вялікай цікавасцю і ўвагай.

Надзвычай плённа працуе Міхаіл Яўгенавіч і ў галіне навуковых даследаванняў. Ён аўтар васьмі манаграфій і вучэбных дапаможнікаў: «Некаторыя выпадкі стылістычнага выкарыстання сінтаксічных сродкаў беларускай мовы» (1958), «З гісторыі беларускай журналістыкі XIX стагоддзя» (1960), «Практычная стылістыка беларускай мовы» (ч. 1, 1962; ч. 2, 1965), «У. І. Ленін і пытанні эстэтыкі публіцыстычнага слова» (1968), «Стылістыка публіцыстычных жанраў» (1971), «Стылістыка беларускай мовы» (1976). У мінулым годзе выйшла яго кніга нарысаў па стылістыцы мастацкай мовы «Сугучнасць слоў жывых...», якая атрымала ўсеагульнае прызнанне чытачоў.

Навуковую і педагагічную дзейнасць М. Я. Цікоцкі спалучае з актыўнай грамадскай працай. Чатыры гады ён працаваў рэдактарам шматтыражнай газеты «Беларускі універсітэт», быў членам парткома універсітэта, у сучасны момант — член партбюро і прафбюро факультэта. Ён член Саюза журналістаў СССР, часта выступае перад рэдакцыйна-выдавецкімі работнікамі з лекцыямі. Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР і Ганаровым знакам Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР «За выдатныя поспехі ў рабоце».

Міхаіл Яўгенавіч поўны творчых сіл, смелых задум на будучае. Мы, яго калегі, сябры, віншуючы юбіляра з важнай датай ў жыцці, жадаем яму моцнага здароўя, бадзёрасці, вялікага плёну ў працы.

А. І. Наркевіч

**Наркевіч, А. І.** Міхаіл Яўгенавіч Цікоцкі (Да 60-годдзя з дня нараджэння)/ А. І. Наркевіч // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. – 1982. - № 1. – С. 80.